


*Ініцыятывы*

# АКЦЭНТ НА ЯКАСЦЬ І ПАДТРЫМКУ

Новы 14-ы сезон Рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі» стартаваў у пачатку лістапада на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Падчас мерапрыемства першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ адзначыў, што ў Год якасці важна, каб узрасла якасць праектаў, якія рэалізоўваюцца канкурсантамі.

— Менавіта таму аргкамітэт прыняў рашэнне арганізаваць асобную намінацыю за якасць прапрацоўкі і ўкаранення ідэі ў рэальны сектар эканомікі. Хочацца, каб нашы канкурсанты, а гэта не толькі школьнікі і студэнцкая моладзь, але і маладыя спецыялісты, праявілі свае веды ў інтэграцыі з установамі адукацыі і навукі, — падкрэсліў ён.

Удзельнікаў мерапрыемства, сярод якіх былі маладыя вучоныя, прадстаўнікі найбуйнейшых устаноў вышэйшай адукацыі краіны, навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў, чакала цікавая праграма. Так, яны з задавальненнем азнаёміліся з пастаянна дзейнай выставай «Дасягненні айчыннай навукі — вытворчасці», дзе прадстаўлены апошнія распрацоўкі беларускіх вучоных, наведалі Музей гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ўзялі ўдзел у фарсайт-дыскусіі «Моладзь Беларусі: навука і інавацыі».




Паводле слоў **старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА,** у Акадэміі навук створаны маладыя акадэміі, у якіх вопытныя вучоныя працуюць з дзецьмі, прычым нават малодшага ўзросту.

— Маладыя акадэмікі пакрокава далучаюць падрастаючае пакаленне да навукі. Дзяцей не адцягнуць ад доследаў, яны гараць жаданнем эксперыментаваць, і мы павінны падсілкоўваць іх цікавасць.

Таксама ён дадаў, што добрым стартам для маладых даследчыкаў стане конкурс «100 ідэй для Беларусі».

— Гэта выдатная пляцоўка для далучэння моладзі да навуковых даследаванняў і распрацовак. Арыентуючыся на актуальныя рынкі, маладое пакаленне зможа прапанаваць для эканомікі нашай краіны, яе развіцця свае ідэі ў розных галінах: ад мікраэлектронікі і прыборабудавання да медыцыны і аграпрамысловага сектара. У іх для гэтага ёсць вялікі патэнцыял.

У сваю чаргу **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ** падкрэсліў, што конкурс «100 ідэй для Беларусі» служыць першым узроўнем адбору інавацыйных ідэй.

— Другі ўзровень — рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў, што праводзіцца ДКНТ, на які сёлета з больш як 200 заявак 63 пададзены пераможцамі конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Для 13 з іх мы на бязвыплатнай аснове распрацавалі бізнес-план. Гэта сведчыць, што выбудаваная ў краіне сістэма работы з маладзёжнымі навуковымі ініцыятывамі працуе.

Традыцыйна старт новага сезона і пачатак прыёму заявак былі дадзены націскам на сімвалічную кнопку. Сёлета выдзелена тры ўзроставыя групы ўдзельнікаў, экспертны савет будзе выбіраць з ліку навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, студэнтаў, курсантаў, працуючай моладзі, маладых вучоных, прадстаўнікоў устаноў, арганізацый, падпарадкаваных НАН Беларусі па тры пераможцы ў кожнай з дзесяці намінацый. Рэалізоўваць конкурс плануюць у чатыры туры: першы — інфармацыйны, другі — адборачны, трэці — прадугледжвае арганізацыю Мінскай гарадской, абласных выставак-прэзентацый і, нарэшце, чацвёрты — рэспубліканскі фінал, які будзе праведзены да 30 красавіка 2025 года.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**